# XI Майскія Віткаўскія чытанні

## “Сейбіт Случчыны”




XI па ліку Майскія Віткаўскія чытанні “Сейбіт Случчыны”. сабралі прыхільнікаў беларускага літаратурнага слова ў Слуцкай раённай цэнтральнай бібліятэцы з 16 па 20 мая 2018 года. Назва Чытанняў абрана невыпадкова: Васіль Вітка нярэдка называў паэтаў і пісьменнікаў сейбітамі беларускага слова, новых думак, добрых пачуццяў. Гэты выраз па праве можна аднесці і да самога Васіля Віткі.



На традыцыйны літаратурны форум ў рамках культурнага маршруту «Мая Беларусь: сучасныя пісьменнікі – дзецям» у Слуцк прыехалі вядомыя літаратары і журналісты Уладзімір Сцяпанавіч Ліпскі, Ганад Бадрыевіч Чарказян, Анастасія Віктараўна Разікевіч. Усе яны лаўрэаты прэміі імя Васіля Віткі.

Пад цудоўную музыку ў выкананні ўзорнага духавога аркестра Слуцкай дзіцячай школы мастацтваў на пляцоўцы каля раённай бібліятэкі танчылі сонечныя промні, сакавітыя фарбы майскага дня надавалі ўрачыстасці яшчэ больш святочнасці: у такой прыгожай паэтычнай атмасферы праходзіла адкрыццё XI Віткаўскіх чытанняў, якое сабрала маленькіх і дарослых чытачоў, слуцкіх школьнікаў, гараджан і сельскіх жыхароў. Дырэктар Слуцкай раённай цэнтральнай бібліятэкі Людміла Васільеўна Гурыновіч адзначыла вялікі ўклад Васіля Віткі ў беларускую літаратуру, асабліва дзіцячую. Мы ганарымся нашым слаўным



землякам, любім і шануем яго творчасць. Многія выраслі на цудоўных казках, апаведах, вершах Васіля Віткі. З задавальненнем дзеці чытаюць цікавейшы беларускамоўны часопіс «Вясёлка», адным з заснавальнікаў якога быў Васіль Вітка, а таксама першым яго рэдактарам. Удзельнікаў Майскіх Віткаўскіх чытанняў вітаў галоўны рэдактар «Вясёлкі» Уладзімір




Сцяпанавіч Ліпскі, які ўзначальвае выданне амаль 40 гадоў! Прывітальны адрас старшыні Слуцкага райвыканкама ўдзельнікам урачыстасці зачытаў начальнік аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Слуцкага райвыканкама Міхаіл Паўлавіч Варабей.

Як заўсёды, на цікавыя творчыя сустрэчы падчас Віткаўскіх чытанняў прыйшлі як дзеці, так і дарослыя. Намеснік галоўнага рэдактара дзіцячага часопіса «Вясёлка» Анастасія Радзікевіч, паэты Ганад Чарказян и Ганна Міклашэвіч у залах бібліятэкі сустрэліся са слуцкімі школьнікамі, расказвалі пра творчасць Васіля Віткі, часопіс «Вясёлка», праводзілі з юнымі случчанамі гульні і віктарыны на веданне беларускай літаратуры, творчасці нашага славутага земляка. На сустрэчу з Уладзімірам Ліпскім з’ехаліся чытачы з усіх куткоў Случчыны. Шчыра кажучы, гэтага чалавека нельга слухаць без захаплення: такія глыбокія, мудрыя яго думкі, на такой прыгожай сакавітай мове ён размаўляе. Уладзімір Сцяпанавіч прызнаўся, шчаслівы ад таго, што быў знаёмы з Васілѐм Віткам, што працягвае яго справу па прызвычайванні маленькіх жыхароў нашай краіны да беларускага слова, адкрыцці для іх прыгажосці, багацця роднай мовы. «Ці ведаеце вы, што беларуская мова па сваёй мілагучнасці на другім месцы ў свеце пасля італьянскай? Любіце родную мову, яна – выток беларускай культуры, вучыцеся ѐй на творчасці вашага земляка Васіля Віткі, ѐн сапраўдны майстар слова», – звярнуўся да юных случчан Уладзімір Сцяпанавіч Ліпскі. А яшчэ ён параіў кіравацца ў жыцці трыма прынцыпамі, якіх прытрымліваўся Васіль Вітка. Чалавек, любі сваю зямлю, і ты будзеш на ѐй гаспадаром – адзін з галоўных. У Год малой



радзімы ён набывае асаблівае значэнне. А яшчэ: ведайце родную мову; навучыцеся любіць людзей, якія вядуць вас па жыцці, вашых родных і блізкіх, тых, хто аддае вам свае сілы, веды, вопыт, пачуцці. Згадзіцеся, вельмі

каштоўныя прынцыпы. Уладзімір Сцяпанавіч адзначыў, што на Случчыне праводзіцца вялікая работа па зберажэнні творчай спадчыны Васіля Віткі. Акцябрская базавая школа нашага раѐна носіць яго імя, закладзена алея імя Васіля Віткі. У.С. Ліпскі расказаў пра навінкі любімага



многімі маленькімі жыхарамі Беларусі часопіса «Вясёлка», якому ў мінулым годзе споўнілася 60 гадоў, а таксама чытанку-маляванку для дашкольнікаў «Буся» і глянцавы часопіс для дзяцей «Домік», узгадаў некаторыя старонкі сваёй кнігі «Уліпкі», звязаныя са Случчынай, падарыў бібліятэцы кнігу серыі «Асобы». На сустрэчы з пісьменнікам прысутнічалі вучні Замосцкай сярэдняй школы, якія плённа супрацоўнічаюць з «Вясёлкай».

Канечне, на працягу ўсіх сустрэч гучалі пранікнёныя вершы Васіля Віткі. Эмацыянальна, шчыра іх чытала пераможца раённага этапу конкурсу



«Жывая класіка» вучаніца СШ №10 імя С.Ф. Рубанава Анастасія Зык. Слуцкія школьнікі прадставілі таксама буктрэйлеры па творах Васіля Віткі. Малюнкі дзяцей па творах сучасных беларускіх пісьменнікаў былі надрукаваны ў часопісе “Вясёлка”.

У другі дзень Чытанняў тэлемост «Майстар роднага слова», прысвечаны Васілю Вітку, злучыў дзве бібліятэкі - Мінскую дзіцячую бібліятэку-філіял №6 імя Васіля Віткі і Слуцкую раённую цэнтральную бібліятэку. Чытачы бібліятэк абмяркоўвалі беларускія творы, размаўлялі пра кнігі, чыталі вершы Васіля Віткі. Самым прыемным момантам онлайн-сеансу сталі стасункі з дзіцячым пісьменнікам, членам Саюза пісьменнікаў Беларусі Міколам Чарняўскім, які падзяліўся ўспамінамі аб сустрэчах з Васіля Віткі, пачытаў свае вершы, адказаў на шматлікія пытанні дзяцей.

Эстафетай разнастайных мерапрыемстваў працягваліся XI Віткаўскія чытанні: тэматычныя выставы, літаратурныя сустрэчы, інтэрактыўныя гульні, агляды літаратуры… Гэта далёка не поўны пералік мерапрыемстваў, што ладзіліся ў межах Віткаўскага тыдня.